ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова Праўлення
Нацыянальнага банка
Рэспублікі Беларусь
19.06.2019 № 253

# ІНСТРУКЦЫЯ
## аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый ”За службу ў інкасацыі“

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый ”За службу ў інкасацыі“ (далей, калі не вызначана іншае, – нагрудны знак).

2. Нагрудным знакам узнагароджваюцца работнікі службаў інкасацыі* банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый і іншыя асобы, указаныя ў пункце 1 Палажэння аб нагрудным знаку службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый ”За службу ў інкасацыі“.

3. Прадстаўленне да ўзнагароджання асоб нагрудным знакам ажыццяўляецца па ініцыятыве:

3.1. Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка або яго намеснікаў;

3.2. кіраўнікоў структурных падраздзяленняў цэнтральнага апарату Нацыянальнага банка;

3.3. кіраўнікоў арганізацый.

4. Для разгляду пытання аб узнагароджанні нагрудным знакам:

4.1. работнікаў службаў інкасацыі банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый і іншых асоб, за выключэннем работнікаў Нацыянальнага банка, арганізацыямі, у якіх яны працуюць, у Нацыянальны банк прадстаўляюцца наступныя дакументы:

суправаджальнае пісьмо;

прадстаўленне да ўзнагароджання нагрудным знакам па форме згодна з дадаткам, запоўненае на беларускай мове з выкарыстаннем камп’ютарных тэхналогій (далей, калі не вызначана іншае, – прадстаўленне да ўзнагароджання нагрудным знакам), якое падпісваецца кіраўніком

---

* Для мэт дадзенай Інструкцыі тэрмін ”работнікі службаў інкасацыі “ выкарыстоўваецца ў значэнні, вызначаным Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 жніўня 2010 г. № 418 ”Об учреждении официальных геральдических символов служб инкассации“.

арганізацыі, яго наместнікам (у выпадку прадстаўлення да ўзнагароджання кіраўніка арганізацыі);

даведка-аб'ектыўка на асобу;

рашэнне калегіяльнага выканаўчага органа арганізацыі аб прадстаўленні да ўзнагароджання асобы (пры яго наяўнасці);

копія старонкі пашпарта, якая пацвярджае прозвішча асобы;

ліст аб узгадненні кіраўніком органа кіравання арганізацыі (пры яго наяўнасці) або кіраўніком вышэйстаячай арганізацыі (у выпадку прадстаўлення да ўзнагароджання кіраўніка арганізацыі);

4.2. работнікаў Нацыянальнага банка ў кадравую службу Нацыянальнага банка накіроўваецца прадстаўленне да ўзнагароджання нагрудным знакам, якое падпісваецца кіраўніком структурнага падраздзялення цэнтральнага апарату Нацыянальнага банка, па ініцыятыве якога асоба прадстаўляецца да ўзнагароджання.

5. Прадстаўленне да ўзнагароджання нагрудным знакам узгадняецца:

наместнікам Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, які накіроўвае дзейнасць структурнага падраздзялення цэнтральнага апарату Нацыянальнага банка, што выступіла ініцыятарам узнагароджання асобы;

наместнікам Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, які накіроўвае дзейнасць кадравай службы Нацыянальнага банка;

кіраўніком кадравай службы Нацыянальнага банка;

пры неабходнасці зацікаўленымі кіраўнікамі структурных падраздзяленняў цэнтральнага апарату Нацыянальнага банка, а таксама наместнікамі Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка, якія накіроўваюць дзейнасць гэтых структурных падраздзяленняў.

6. Прадстаўленне да ўзнагароджання нагрудным знакам, узгодненае ў парадку, устаноўленым пунктам 5 дадзенай Інструкцыі, і іншыя дакументы, прадугледжаныя пунктам 4 дадзенай Інструкцыі, прадстаўляюцца для разгляду Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка.

Па выніках разгляду Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка прымаецца рашэнне:

аб узнагароджанні нагрудным знакам;

аб адхіленні прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам.

7. У выпадку прыняцця рашэння аб узнагароджанні нагрудным знакам, нагрудны знак і пасведчанне да яго па форме, зацверджанай пастановай, якая зацвердзіла дадзеную Інструкцыю, уручаюцца Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка або яго наместнікамі асабіста ўзнагароджанаму ва ўрачыстай абстаноўцы.

Адначасова работнікам Нацыянальнага банка, узнагароджаным нагрудным знакам, выплачваецца грашовая прэмія ў памеры, прадугледжаным лакальным прававым актам Нацыянальнага банка.

Прэміраванне работнікаў службаў інкасацыі банкаў, нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый, іншых асоб у сувязі з узнагароджаннем нагрудным знакам ажыццяўляецца за кошт сродкаў арганізацыі ва ўстаноўленым адпаведнай арганізацыяй парадку.

8. У выпадку адхілення прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам ініцыятар узнагароджання інфармуецца аб адмове.

Дадатак
да Інструкцыі аб парадку прадстаўлення да ўзнагароджання нагрудным знакам службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый ”За службу ў інкасацыі“

Форма

ПРАДСТАЎЛЕННЕ
да ўзнагароджання нагрудным знакам
службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых
арганізацый ”За службу ў інкасацыі“

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку
(пры яго наяўнасці)

2. Чысло, месяц і год нараджэння

3. Пасада, месца працы (службы)

4. Грамадзянства

5. Стаж работы:

у Нацыянальным банку

у банкаўскай сістэме
у іншай арганізацыі

6. Звесткі аб узнагароджаннях, у тым ліку аб узнагароджаннях Нацыянальнага банка (чым, калі)

7. Характарыстыка з указаннем падстаў, вызначаных у пункце 1 Палажэння аб нагрудным знаку службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый ”За службу ў інкасацыі“, па якіх асоба прадстаўляецца да ўзнагароджання нагрудным знакам службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый ”За службу ў інкасацыі“

| ____________________ | ____________ | ____________ |
|---|---|---|
| (пасада) | (подпіс) | (ініцыялы, прозвішча) |

”___“_________20__ г.

Дадатак да
пастановы Праўлення
Нацыянальнага банка
Рэспублікі Беларусь
19.06.2019 № 253

Форма

# ПАСВЕДЧАННЕ
## да нагруднага знака службы інкасацыі банкаў і нябанкаўскіх крэдытна-фінансавых арганізацый ”За службу ў інкасацыі“

| | | |
|---|---|---|
| Каляровае адлюстраванне нагруднага знака | Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 10.08.2010 № 418<br><br>”За службу ў інкасацыі“ | Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь<br><br>ПАСВЕДЧАННЕ № ____<br>_______________________________________<br><br>загадам Старшыні Праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь ад ”___“ ___________ 20__ г. № ____<br>узнагароджаны(а) нагрудным знакам ”За службу ў інкасацыі“<br><br>Старшыня Праўлення ________________ |